Зеленый портал

18.03.2019

# Рыхтуемся да Гадзіны Зямлі і прыадкрываем таямніцы “цёмнай” гадзіны для планеты

**На прыканцы сакавіка Беларусь у 11 раз далучыцца да самай буйной і прыгожай экалагічнай акцыі – Гадзіны Зямлі. Таварыства “Зялёная сетка” прыадкрывае таямніцу, што цікавага будзе на гэтым івэнце.**

Хрысціна Чарняўская

Фота: Зялёны партал



“*Акцыя «Гадзіна Зямлі» асабліва палюбілася нам за столькі год яе правядзення. Нягледзячы на тое, што яна носіць сімвалічны характар, праз яе прастату і яркасць можна зачапіць людзей і дапамагчы задумацца пра важныя экалагічныя праблемы – змяненне клімата, абмежаванасць прыродных рэсурсаў, утаймаванне спажывецкага стаўлення да наваколля*”, - кажуць у экалагічным таварыстве.

Штогод для акцыі абіраецца загалоўная тэма. На гэты раз таварыства абрала тры.

## Гадзіна Зямлі. За чыстае паветра

Па словах экалагістаў, гэта зусім не выпадкова. Цягам апошняга года даводзіцца назіраць, як усё больш гарадоў сутыкаецца з праблемаю забруджвання паветра ад работы прамысловых прадпрыемстваў.

У шэраг пацярпелых гарадоў уваходзяць: Светлагорск, Гомель, Магілёў. А таксама Брэст, які пакуль “працуе” на перспектыву пазбегнуць лёсу забруджвання ад акумулятарнага завода, і Мінск, дзе збіраюцца будаваць завод па спальванні смецця.

## Гадзіна Зямлі. За чыстае наваколле

Праблема існавання несанкцыянаваных звалак у лясах, на берагах азёр і рэк, у месцах масавага адпачынку людзей ці ля дачных пасёлкаў ужо не першы год актуалізуецца актывістамі і актывісткамі беларускага руху “Зробім!” - часткі міжнароднага руху “Let’s do it!”.

Удзел у прыборках – справа дабраахотная, і гэта адрознівае рух ад звыклых суботнікаў, як і тое, што кожны жадаючы можа стаць ініцыятарам акцыі ў сваім населеным пункце. У гэтым годзе сезон прыборак у нашай краіне стартуе ў красавіку і скончыцца ў Дзень глабальнай прыборкі – 21 верасня.

## Гадзіна Зямлі. За чыстую энергетыку

Наша краіна непазбежна набліжаецца да моманту запуска першага энергаблока Беларускай АЭС. На пачатку 2019 года прайшло чарговае грамадскае абмеркаванне, якое тычылася Стратэгіі абыходжання з ядзерным палівам, што прадэманстравала негатоўнасць Беларусі ўводзіць атамную станцыю ў эксплуатацыю. Гэта без уліку, адсутнасці адказаў па мэтазгоднасці яе будаўніцтва і практычнай рэалізацыі збыту электраэнергіі і г.д.

У мінулым годзе грамадскае аб’яднанне “Экадом” разам з таварыствам “Зялёная сетка” і Фондам імя Генрыха Бёля ініцыявалі даследаванне па магчымасцям Беларусі быць энергетычна незалежнай краінай праз аднаўляльныя крыніцы энергетыкі - Энергетычная [р]эвалюцыя.

Даследаванне паказала, што дастатковага ўзроўню энергазабяспечанасці можна дасягнуць пры дапамозу сучасных і бяспечных тэхналогій. Вядома, што дзеля іх укаранення патрабуюцца змяненні ў падыходах развіцця некаторых узаемазвязаных галін.

“*Кожная гэта тэма важная для нас! І кожную мы намераны трансляваць падчас акцыі Гадзіна Зямлі. Заклікаем рабіць гэта і тыя сяброўскія арганізацыі, што далучацца да івэнта ў бягучым годзе, і пастарацца максімальна выкарыстаць акцыю, як пляцоўку для данясення чыстых ідэй*”, - тлумачаць у Зялёнай сетцы.

Традыцыйна ў гэты дзень 20.30 да 21.30, некаторыя гарадскія аб’екты пагрузяцца ў цемру, адключыўшы знешнюю элюмінацыю. На сённяшні дзень свой удзел падцвердзілі ЦУМ, Музей Вялікай Айчыннай вайны і Банк развіцця, УП "Мінгарсвятло", з 21.00 да 21.30 Нацыянальная бібліятэка Беларусі ў Мінску і Маладзечанскі раённы выканаўчы камітэт.





“*Гэта неверагоднае відовішча, якое выклікае казытлівае адчуванне ўнутры. Адключэнне адбываецца не столькі дзеля эканоміі, колькі, як заява пазіцыі і разумення неабходнасці дзейнічаць і вырашаць экалагічныя праблемы зараз, не перакладаць адказнасць на наступныя пакаленні*, - падкрэсліваюць у таварыстве. - *Пры ўсім, прыемна, што сёння нам не трэба тлумачыць і пераконваць пра неабходнасць удзелу некаторыя аб’екты, для іх Гадзіна Зямлі ўжо стала справай звычкі”*.

Арганізатары заклікаюць не прапусціць “цёмную” гадзіну і быць актыўнымі саўдзельнікамі чароўнай дзеі. Узровень удзелу можа быць на густ чалавека: шпацыр па горадзе, каб стаць сведкам далучэння да глабальнага руху, наведванне культурніцкай часткі праграмы ці больш ціхі вечар у сяброўскай кампаніі з забаўкамі дома без святла.



“*У нас будзе некалькі цікавых прапановаў, чым можна пазабавіць сябе ў культурным плане ці стаць непасрэдным удзельнікам акцыі, падрабязна і актыўна пачнем расказваць пра іх літаральна з гэтага тыдня*”, - упэўніваюць у Зялёнай сетцы.

Пакуль што можна запланаваць наведаць галоўную падзею вечара 30 сакавіка: таварыства запрашае мінчан і мінчанак на канцэрт гурта Recha, што будзе ў рэгі-бары “Жованы крот” на Зыбіцкай, 6. Імпрэза пачнецца а 20.00, а 20.30 пагасне святло і зайграе гурт.

“*Гэта музыка для роздумаў і для танцаў, для якіх будзе месца. Спадзяемся, што вам спадабаецца спалучэнне домбры, цемры і песень*”, - кажуць у Зялёнай сетцы.

Калі вы маеце невялікі інструмент для перкусіі ці любую рэч, гук якой вам падабаецца, – можна ўзяць з сабой паўдзельнічаць у невялікім джэме. Уваход вольны. Арганізатары раяць не спазняцца: прастора бара гасцінная, але абмежаваная.

Адначасова будзе працаваць Зялёная пошта. Гэта азначае, што кожны жадаючы зможа выбраць акварэльную друкаваную паштоўку, падпісаць ды, не выходзячы з бара, даслаць блізкім і сябрам.

Малюнкі на паштоўках прысвечаныя зменам, што адбываюцца ў прыродзе і асяродку, створаным чалавекам, праз змяненне клімата, а таксама экалагічным праблемам, з якімі даводзіцца сутыкацца штодня.

Паштоўкі створаныя для таварыства “Зялёная сетка” і грамадскага аб'яднання “Экадом” па матывах працы сэрвісу Зялёны тэлефон. А таксама можна будзе прынесці з сабой крышачкі ад пластыкавых бутэляк і здаць іх валанцёрам і валанцёркам, і такім чынам падтрымаць ініцыятыву "Новае жыццё ўзамен на крышачкі".